УДК 7.071.1:75:378.096(476.5-25)"1934/2012"

# Леанід Анцімонаў (1934–2012): нястомны эксперыментатар, улюбёны ў мастацтва

*Цыбульскі М.Л.*
*Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава", Віцебск*

*Артыкул прысвечаны жыццю і творчасці вядомага беларускага мастака і педагога Леаніда Анцімонава, асаблівасцям яго творчай і педагагічнай дзейнасці, стылістыцы графічных і жывапісных работ. Таленавіты мастак і неардынарны педагог больш за 40 гадоў выкладаў на мастацка-графічным факультэце Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута, кіраваў там графічнай майстэрняй.*

*У артыкуле прасочваецца шлях Анцімонава ў мастацтва – вучоба ў Рыжскім мастацка-рамесніцкім вучылішчы, вучылішчы прыкладнога мастацтва ў г. Рызе, на мастацка-графічным факультэце Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута, пасля заканчэння якога Леанід Анцімонаў пачаў тут сваю педагагічную дзейнасць ужо ў якасці выкладчыка на кафедры малюнка і жывапісу.*

*Асабістым дасягненнем Л. Анцімонава можна лічыць арганізаваную ім на мастацка-графічным факультэце графічную (эстампную) майстэрню, дзе студэнты вывучалі магчымасці традыцыйных графічных тэхнік, ставілі эксперыменты, намагаліся адкрыць новыя.*

*Творчасць мастака даволі складана адназначна акрэсліць канкрэтнымі стылістычнымі, жанравымі, вобразна-сэнсавымі асаблівасцямі. Леанід Анцімонаў – асоба падкрэслена полістылістычная, з шырокім дыяпазонам мастацкіх інтарэсаў. Нягледзячы на шчырую ўлюбёнасць Леаніда Анцімонава ў жывапіс, яго творчасць і педагагічная дзейнасць найбольш звязаны з графікай. На працягу ці не ўсёй творчасці мастака асноўным полем для рэалізацыі яго эксперыментальных ідэй з'яўлялася манатыпія.*

*У артыкуле таксама апавядаецца аб творчым супрацоўніцтве мастакоў Л. Анцімонава, А. Салаўёва і А. Арлова, утварэнні імі нефармальнай творчай групы "ОСА".*

***Ключавыя словы:*** *Леанід Анцімонаў, жывапіс і графіка XX–XXI ст., мастацка-графічны факультэт, тэхнікі друку, эстамп, манатыпія, афорт, экслібрыс, нефармальная творчая група.*

*(Искусство и культура. – 2025. – № 1(57). – С. 5–11)*

# Leonid Antimonov (1934–2012): a Tireless Experimenter, in Love with Art

*Tsybulsky M.L.*
*Education Establishment "Vitebsk State P.M. Masherov University", Vitebsk*

*The article is devoted to the life and work of the famous Belarusian artist and teacher Leonid Antimonov, the features of his creative and pedagogical activity, the style of graphic and painting works. A talented artist and an extraordinary teacher, he taught at the Art and Graphic Faculty of the Vitebsk State Pedagogical Institute for more than 40 years, and headed the graphic workshop there.*

*The article analyzes Antimonov's path to art-studies at the Riga Art and Crafts School, the School of Applied Arts in Riga, at the Art and Graphic Faculty of the Vitebsk State Pedagogical Institute, after graduating from which Leonid Antimonov began his pedagogical activity here as a teacher at the Department of Drawing and Painting.*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: mtsybulsky@rambler.ru – М.Л. Цыбульскі*

*Personal achievement of L. Antimonov can be considered a graphic (print) workshop organized by him at the Faculty of Art and Graphics, where students studied the possibilities of traditional graphic techniques, experimented, trying to discover new ones.*

*The artist's work is quite difficult to define unambiguously with specific stylistic, genre, figurative and meaningful features. Leonid Antimonov is a person who is emphasized polystylistic, with a wide range of artistic interests. Despite Leonid Antimonov's sincere love for painting, his creativity and pedagogical activity are most closely connected with graphics. Throughout almost all of the artist's work, monotype was the main field for the implementation of his experimental ideas.*

*The article also tells about the creative cooperation of artists L. Antimonov, A. Solovyov and A. Orlov, their formation of the creative group "OSA".*

***Key words:*** *Leonid Antimonov, painting and graphics of the XX–XXI century, Art and Graphic Faculty, printing techniques, printmaking, monotype, etching, ex libris, informal creative group.*

*(Art and Cultur. – 2025. – № 1(57). – P. 5–11)*

## *Да 90-годдзя з дня нараджэння мастака-педагога і 50-годдзя стварэння графічнай майстэрні на мастацка-графічным факультэце*

Леанід Анцімонаў... Без яго імя немагчыма ўявіць сабе гісторыю мастацка-графічнага факультэта. Таленавіты мастак і неардынарны педагог, ён больш за 40 гадоў выкладаў тут малюнак, жывапіс, кампазіцыю, кіраваў графічнай майстэрняй. У сваёй педагагічнай дзейнасці заўсёды быў уважлівы да студэнта, імкнуўся развіць індывідуальныя творчыя схільнасці кожнага, упэўненасць ва ўласным творчым патэнцыяле, дапамагаў знайсці сябе ў мастацтве. Леанід Анцімонаў – "прыгожай душы чалавек"[1], "па прыродзе сваёй танчайшы!"[2] – сваіх калег і вучняў уражваў высокай культурай зносін, падкрэсленай ветлівасцю, ураўнаважанасцю і сціпласцю.

Адметнай рысай пазіцыі Леаніда Анцімонава ў мастацтве былі логіка развааг, тактоўнасць у спрэчках, у чым не аднойчы мог пераканацца і аўтар дадзенага матэрыялу ў час шматлікіх інтэрв'ю і дыялогаў, якія пакладзены ў аснову гэтага даследавання.

Мэта артыкула – прааналізаваць асноўныя этапы жыцця і творчасці Леаніда Анцімонава, асаблівасці яго творчай і педагагічнай дзейнасці, стылістыку графічных і жывапісных работ.

**Шлях у мастацтва.** Леанід Анцімонаў нарадзіўся ў 1934 г. у вёсцы Куляшы на Сенненшчыне, дзе  і прайшло яго дзяцінства. "Я з сялянскай сям'і. Маім выхаваннем займаліся маці і бабуля"[3]. "Мой бацька быў чалавекам творчым, валодаў некалькімі музычнымі інструментамі. У мяне таксама быў маленькі акардэон, на якім я пілікаў, імправізаваў. Але каб купіць казу, мы вымушаны былі акардэон прадаць. Пазней, у Рызе, я нават наведваў гурток баяністаў, вывучыў ноты... Але сказалі, што баяны нам не дадуць, пакуль не навучымся «ганяць гамы» на звычайных дошках з намаляванай клавіятурай. На тым мая музычная кар'ера і скончылася. Але любоў да музыкі засталася на ўсё жыццё"[4].

Знаёмства Леаніда Анцімонава з выяўленчым мастацтвам пачалося, як і ў большасці, з дзяцінства: да творчасці ён далучыўся дзякуючы свайму вясковаму настаўніку – самадзейнаму мастаку-франтавіку М.П. Афанасьеву. "У шостым класе я шмат маляваў, – узгадваў Леанід Сяргеевіч, – асабліва захапіўся шрыфтавой працай. Я нават афармляў выбарчы ўчастак, аб чым пісала наша мясцовая багушэўская раённая газета. А першым намаляваным мною творам была перамалёўка рэпрадукцыі партрэта А.С. Пушкіна. Мой выкладчык фізікі падхапіў малюнак і насіў яго па класах прыгаворваючы: «Гэта Анцімонаў намаляваў!»" [1].

Пасля заканчэння сямігадовай школы ў 1950 годзе Л. Анцімонаў паступіў у Рыжскае мастацка-ремеснае вучылішча. "Нягледзячы на тое, што атэстат аб заканчэнні сямі класаў у мяне быў з адзнакай, мой выбар установы для паступлення быў у першую чаргу абумоўлены тым, што вучні ў рамесніцкім вучылішчы былі цалкам на дзяржаўным забеспячэнні. Бо жылося тады не проста..."[5] Калі Анцімонаў ехаў вучыцца ў рамесніцкае вучылішча ў Рызе, ён лічыў мастацтвам ужо будучую спецыяльнасць – альфрэйшчык (...). Падобных спецыялістаў рыхтавалі для выканання дэкаратыўна-манументальнага жывапісу, які шырока ўжываўся для роспісу інтэр'ераў" [2]. Замест вызначаных трох гадоў навучання Анцімонаў

[1] Выступленне В. Дарафеевай на адкрыцці выставы Л. Анцімонава 18 студзеня 2010 г. Архіў Ф. Грынеўскага.
[2] З прамовы А. Мемуса на адкрыцці выставы Л. Анцімонава ў красавіку 2019 года. Запіс Ф. Грынеўскага.
[3] Выступленне Л. Анцімонава на творчай вечарыне 18 студзеня 2010 г. Архіў Ф. Грынеўскага.
[4] З інтэрв'ю з Л. Анцімонавым. Запіс – снежань 1999 г.
[5] Там жа.

скончыў вучылішча за два гады, атрымаў дыплом майстра альфрэйнага жывапісу з адзнакай і дазвол ад міністэрства паступаць адразу на трэці курс у пяцігадовае вучылішча прыкладнога мастацтва ў г. Рызе.

“У Рыжскім вучылішчы я з асаблівым захапленнем займаўся жывапісам. Менавіта ў гэтым цудоўным горадзе я ўпершыню трапіў у музей, дзе быў прадстаўлены жывапіс, і быў зачараваны ім. Невыпадкова і мая дыпломная работа была па жывапісе на тэму «Апошні прыпынак». Тралейбус, кандуктар, вячэрняе асвятленне”[6]. Захавалася некалькі партрэтных эцюдаў, напісаных алеем пасля заканчэння Рыжскай вучэльні прыкладнога мастацтва (“Партрэт маці”, “Аўтапартрэт”). Гэтыя творы, выкананыя ў лепшых рэалістычных традыцыях, дарэчы, у свой час ухваляў славуты рускі мастак А.А. Мыльнікаў, калі Анцімонаў прыязджаў у Ленінградскую акадэмію мастацтваў з мэтай працягнуць там сваю адукацыю [3]. Але ж лёс склаўся іначай... “Пасля заканчэння вучобы ў Рызе быў накіраваны на працу ў вясковую школу ў Магілёўскай вобласці. Адтуль пайшоў у армію. Пасля службы вярнуўся ў Віцебск і ўладкаваўся выкладчыкам у тэхнічнае вучылішча № 19”[7].

**Мастацка-графічны факультэт. Вучоба і педагагічная дзейнасць.** Паступленне на вучобу на мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута было для Л.С. Анцімонава глыбока асэнсаваным. Жаданне прафесійна ўдасканальвацца ў мастацтве было першапачатковым. “Яшчэ ў час паступлення на мастацка-графічны факультэт Анцімонаў па ўзроўні сваёй мастацкай адукацыі ўжо гатовы быў працаваць выкладчыкам, – узгадваў яго настаўнік, а пазней калега Р. Клікушын”[8]. Ды і аднакурснікі Анцімонава адзначалі, што “з першых заняткаў заўважалася яго вельмі грунтоўная падрыхтоўка па спецыяльных дысцыплінах, якую ён атрымаў у Рызе” [2]. Пасля заканчэння мастацка-графічнага факультэта пединстытута ў 1963 годзе Леанід Анцімонаў пачаў тут сваю педагагічную дзейнасць ужо ў якасці выкладчыка на кафедры малюнка і жывапісу.

Спалучэнне прафесіі мастака з педагагічнай практыкай з пункту гледжання многіх “вольных” творцаў у мастацтве – няўдзячная праца. Каментуючы гэта ў адным са сваіх інтэрв’ю, Леанід Анцімонаў казаў: “Наўрад ці з гэтым можна пагадзіцца. Безумоўна, ты вымушаны дзяліць сваё жыццё. Але абодва гэтыя заняткі творчыя. Я адчуваю сапраўднае задавальненне і ад уласнай творчасці, і ад працы са студэнтамі. Нярэдка новыя цікавыя ідэі з’яўляюцца менавіта ў час заняткаў з імі. Калі раблю ўласную кампазіцыю, думаю пра тое, як той ці іншы мастацкі вопыт перадаць сваім вучням. Канешне, як мастак, я, напэўна, зрабіў бы больш, калі б не працаваў педагогам. Але сёння вучні – гэта частка мяне” [1].

Леанід Анцімонаў на мастацка-графічным факультэце выкладаў малюнак, жывапіс, кампазіцыю, адчуваючы сапраўднае задавальненне ад працы са студэнтамі, як і ад уласнай творчасці. Прыроднае пачуццё гармоніі, злучанае з грунтоўнымі ведамі ў розных галінах выяўленчага мастацтва, заўжды выклікала давер і павагу да добра развітай інтуіцыі Леаніда Анцімонава з боку яго вучняў. Асаблівая павага да мастака, які шмат што ў мастацтве можа сам, заўжды прыцягвала да яго студэнтаў.

Анцімонаў ніколі не імкнуўся ўмешвацца ў аўтарскія ідэі студэнтаў, але спрабаваў дапамагчы ім выявіць індывідуальныя асаблівасці, развіць іх творчы патэнцыял. Педагогам была распрацавана арыгінальная праграма па розных відах графікі, створаны дапаможнікі, вартыя сур’ёзнай увагі спецыялістаў. Не выпадкова менавіта творчы вопыт Л. Анцімонава зацікавіў замежнікаў, і яму ў пачатку 1990-х было прапанавана на працягу трох гадоў выкладаць графіку ў Зеленагурскай вышэйшай педагагічнай школе. “Працаваць там было асабліва цікава. У Польшчы я шмат займаўся творчасцю, рабіў нават эскізы дэкарацый і касцюмаў для аднаго з дзіцячых тэатраў” [1].

Уласцівы Анцімонаву дэмакратызм у адносінах да творчых эксперыментаў сваіх вучняў заўжды спалучаўся з сур’ёзнай патрабавальнасцю, настойлівасцю і нават педантызмам у дачыненні да мастацкага рамяства. Педагог вучыў знаходзіць спецыфічную мову для выражэння таго, што хвалюе студэнтаў, дапамагаў ім змагацца з уласцівым для чалавека імкненнем прымаць межы свайго бачання за межы светаўладкавання. Адзнакі за студэнцкія працы ставіў “з разлікам іх далейшага псіхалагічнага ўздзеяння на працэс вучобы, – адзначаў Леанід Сяргеевіч. – Бывае свядома завышаю адзнаку, ведаючы, што гэта паспрыяе яшчэ больш упартай працы студэнта над сабой. Часам не стаўлю, напрыклад, двойку, калі пасля доўгіх пошукаў праца не атрымалася. Тым больш што ў мастацтве гэта натуральная з’ява” [1].

Л. Анцімонаў не шкадуючы дзяліўся са студэнтамі ўласнымі ведамі, напрацоўкамі, уменнямі, вопытам. Педагог быў перакананы, што

[6] З інтэрв’ю з Л. Анцімонавым.

[7] Выступленне Л. Анцімонава на адкрыцці персанальнай выставы 18 студзеня 2010 г. Архіў Ф. Грынеўскага.

[8] З выступлення Р. Клікушына на творчай вечарыне Л. Анцімонава 18 студзеня 2010 г. Архіў Ф. Грынеўскага.

студэнт заўсёды павінен бачыць, што выкладчык у мастацтве можа сам. Ад гэтага залежыць аўтарытэт мастака-педагога, давер да яго. “Анцімонаў быў яркай асобай, карыстаўся асаблівай папулярнасцю ў студэнтаў. Увогуле, у апошніх адкрываліся нечаканыя патэнцыі... Самі студэнты, якія праходзілі праз яго рукі, часам дзівіліся: адкуль што прарастала. У Анцімонава было ўменне ствараць з любога сельскага хлопчыка АСОБУ!”[9] І разам з тым на прапанову назваць сваіх лепшых вучняў Анцімонаў адказваў: “Для мяне прынцыпова важна, каб не я назваў гэтыя прозвішчы, а былыя выпускнікі назвалі мяне сваім настаўнікам”[10]. “Калі адзін з маіх студэнтаў Канстанцін Прашковіч праз некалькі год пасля заканчэння факультэта сказаў мне, што я адзіны яго настаўнік, ці іншы мой студэнт Алег Аблажэй, калі скончыў акрамя Віцебскага інстытута яшчэ і Вільнюскі мастацкі інстытут, прызнаўся, што любоў да графікі з’явілася ў яго ў час нашых заняткаў, значыць я на гэтых сёння вядомых таленавітых мастакоў чымсьці паўплываў”[11].

“Школа – гэта развіццё, на мой погляд, розных спосабаў бачання рэальнасці, – упэўнена сцвярджаў Л. Анцімонаў. – Наша ж школа, у шырокім сэнсе гэтага слова, вельмі кансерватыўная...” [1]. Мастак быў перакананы, што педагог павінен валодаць шырокім дыяпазонам творчых прыёмаў, падтрымліваць розныя творчыя пазіцыі сваіх вучняў. Напэўна, як ніхто іншы з выкладчыкаў таго часу, ён быў заклапочаны арганізацыйнымі мерапрыемствамі, удзельнічаў у выставах, выступаў на тэлебачанні [2]. Вядомы віцебскі паэт Давід Сімановіч узгадваў, як Анцімонаў рабіў уласныя перадачы на віцебскай тэлестудыі і быў дарадцам на перадачах, якія прысвячаліся выяўленчаму мастацтву[12].

**Графічная майстэрня.** Асабістым дасягненнем Л. Анцімонава можна лічыць арганізаваную ім на мастацка-графічным факультэце графічную (эстампную) майстэрню. “У сярэдзіне 1960-х я не меў ніякага ўяўлення пра графіку, – успамінаў Анцімонаў. – Я пачаў шукаць матэрыялы, чытаў кнігі па графіцы, знаёміўся з рознымі тэхнікамі друку”[13]. Леанід Сяргеевіч прыклаў шмат намаганняў для таго, каб у 1970 годзе трапіць на стажыроўку на факультэт графікі ў Латвійскую акадэмію мастацтваў. Праца ў Рызе пад кіраўніцтвам выдатных мастакоў-графікаў Петэрыса Упіціса і Артура Апініса заклала грунтоўны падмурак для далейшай працы Анцімонава на многія гады. Прафесар Артур Апініс у гэты час загадваў факультэтам графікі Латвійскай акадэміі мастацтваў, быў шырока вядомы як латвійскі і савецкі мастак, графік, майстар кніжнай графікі. Асабліва захапляўся літаграфіяй. Яго калега прафесар Петэрыс Упіціс вёў майстэрню кніжнай графікі. “Адзін з самых значных латвійскіх майстроў ксілаграфіі, ён працаваў у гэтай тэхніцы з канца 1930-х гадоў і ведаў яе дасканала. Ужо ў 1960-я ён захапіўся экслібрысам, стварыў некалькі сотняў персанальных бібліятэчных знакаў, у тым ліку і ў тэхніцы ксілаграфіі, стаў нават старшынёй секцыі экслібрыса Добраахвотнага таварыства аматараў кнігі. Кніжка пра экслібрыс, якую падарыў мне П. Упіціс, натхніла на больш глыбокае спасціжэнне гэтага мастацтва”[14].

“Дзякуючы падтрымцы Індуліса Зарыня, славутага латышскага мастака, на той час прарэктара Акадэміі мастацтваў, мне дазволілі працаваць у графічнай майстэрні. Я паставіў перад сабой мэту: прайсці ўсю акадэмічную праграму па графіцы за адзін год. Працаваў па 15–16 гадзін кожны дзень, у розных графічных тэхніках...” [1].

Пасля вяртання са стажыроўкі Л. Анцімонаў узяўся за стварэнне графічнай майстэрні. “Трэба шчыра прызнаць, што стварэнне яе нікому, акрамя мяне, не было патрэбна, – адзначаў майстра. – Разумеючы гэта, я спачатку пераканаў кіраўніцтва інстытута ў неабходнасці набыцця спецыяльнага абсталявання для заняткаў графікай. Сам збіраў паперкі для гэтай справы. Давялося выходжваць іх у шэрагу ўстаноў: ад Саюза мастакоў да КДБ. Моцна дапамог тагачасны рэктар В.Н. Вінаградаў у набыцці друкарскага станка, у выдзяленні даволі значных грашовых сродкаў. Станкі даставалі ў Мінску ў Саюзе мастакоў. Калі абсталяванне купілі, паўстала другое пытанне: куды яго паставіць? У той час вялося будаўніцтва галоўнага корпуса ВДПІ на Маскоўскім праспекце, і нам на першым паверсе пад майстэрню выдзелілі аўдыторыю № 140. З Рыгі я прывёз 60 кг цынкавых пласцін... Больш не здолеў. Заказваў інструменты, дабываў фарбу, вазіў матэрыялы з Масквы, Мінску...”[15].

“Анцімонаў, – распавядаў М. Гугнін, – прыехаў з Рыжскай акадэміі мастацтваў з асаблівым жаданнем займацца творчасцю. У выніку ім была створана поўнамаштабная майстэрня графікі”[16]. Яго калега, выдатны мастак і педагог Алесь Мемус удакладняў: “У межах мастацка-графічнага факультэта Анцімонаву ўдалося

9 З прамовы А. Мемуса на адкрыцці выставы Л. Анцімонава ў красавіку 2019 года. Запіс Ф. Грынеўскага.
10 З інтэрв’ю з Л. Анцімонавым. Запіс – снежань, 1999 г.
11 З інтэрв’ю з Л. Анцімонавым. Запіс – снежань 2009 г.
12 З гутаркі з Д. Сімановічам. 2010 г.
13 З інтэрв’ю з Л. Анцімонавым. Запіс – снежань 1999 г.
14 З інтэрв’ю з Л. Анцімонавым. Запіс – снежань 2009 г.
15 З інтэрв’ю з Л. Анцімонавым. Запіс – снежань 1999 г.
16 З выступлення М. Гугніна на адкрыцці выставы Л. Анцімонава 18 студзеня 2010 г. Архіў Ф. Грынеўскага.

стварыць сваю – Анцімонаўскую акадэмію (...) Гэты асяродак ён зрабіў уласнымі высілкамі. Калі ўрэшце склалася «гняздоўе» Анцімонава, ён пачаў год за годам абрастаць нейкім абсталяваннем. Многа было і ўласных грошай пакладзена. Калі я пасля заканчэння Пецярбургскай акадэміі прыехаў у Віцебск, я быў здзіўлены тым, што графічная майстэрня на МГФ знаходзіцца амаль на тым узроўні, як і ў Расійскай імператарскай акадэміі мастацтваў, якая, як вядома, мела каласальныя традыцыі!”[17].

У графічнай майстэрні разам з Анцімонавым студэнты вывучалі магчымасці традыцыйных графічных тэхнік, ставілі эксперыменты, намагаючыся адкрыць новыя. Да вельмі папулярнага яшчэ пры Р. Клікушыне лінарыту дабавіліся новыя тэхнікі. У гэтай майстэрні студэнты выконвалі афорты, літаграфіі, дрэварыты, займаліся дыятыпіяй, фларатыпіяй, гравюрай на кардоне, фанеры і ДВП, выкарыстоўвалі камбінаваныя тэхнікі, калажны спосаб гравюры. Дарэчы, тэхналогія выканання апошняга, званага Л. Анцімонавым “інкарэллю”, асабліва дакладна была распрацавана мастаком. Таксама, як і магчымасці манатыпіі, што ператварылася ў своеасаблівую “візітоўку” майстра, вызначаючы творчае крэда гэтага беларускага мастака.

Важным накірункам дзейнасці Анцімонава і графічнай майстэрні сталі выкананне курсавых і дыпломных работ у розных графічных тэхніках, гуртковая дзейнасць і нават арганізацыя мастацкіх выстаў студэнтаў. Адбор для ўдзелу ў такіх экспазіцыях быў даволі жорсткі, менавіта таму на іх было нямала высокапрафесійных твораў. Пра гэта сведчаць каталогі некаторых з выстаў, якія былі падрыхтаваны пры непасрэдным удзеле Л. Анцімонава.

У 1985 годзе майстэрня графікі пераязджае ў іншае памяшканне – новы корпус мастацка-графічнага факультэта. Пры гэтым асноўнай задачай эстампнай майстэрні па-ранейшаму застаецца падрыхтоўка і правядзенне заняткаў па дысцыплінах “Графіка” і “Тэхнікі графікі”. “У 1986 годзе Л.С. Анцімонаў, будучы ўжо цудоўным спецыялістам і прызнаным майстрам, стажыраваўся ў БДТМІ (цяпер БДАМ) у г. Мінску на кафедры графікі ў прафесара У. Шаранговіча, пашыраючы свой вопыт у афорце, асвойваючы літаграфію. Несумненна, яго стажыроўкі ў навучальных установах такога ўзроўню садзейнічалі ўдасканаленню творчага патэнцыялу і росту педагагічнага майстэрства. За час кіраўніцтва эстампнай майстэрняй ім быў напісаны шэраг навучальных дапаможнікаў па гравюры на кардоне і па манатыпіі, дзе кожная рэкамендацыя падмацоўвалася практычнымі напрацоўкамі і эксперыментамі аўтара” [4]. Вынікам актыўнай збіральніцкай працы Анцімонава стала стварэнне цікавага вучэбна-метадычнага фонду вучэбных, курсавых, дыпломных і творчых работ, які ўключыў калекцыю твораў студэнтаў, сабраную Р. Клікушыным, а пазней набыў працяг у дзейнасці наступнага кіраўніка графічнай майстэрні А. Кастагрыза.

**Прастора творчасці.** Творчасць мастака даволі складана адназначна акрэсліць канкрэтнымі стылістычнымі, жанравымі, вобразна-сэнсавымі асаблівасцямі. Леанід Анцімонаў – асоба полістылістычная, з шырокім дыяпазонам творчых захапленняў і шматграннасцю мастацкіх інтарэсаў. Яго творчасць – уласны погляд на свет, у аснове якога ляжыць добры мастацкі густ, памножаны на высокі ўзровень прафесіяналізму [3].

Леанід Анцімонаў – самаадданы прыхільнік традыцый высокай класікі і апантаны эксперыментатар. Дзве гэтыя рысы вельмі гарманічна спалучаліся ў яго творчай натуры, не замінаючы адна адной. Магчыма дзякуючы гэтаму ў графічных і жывапісных творах мастака яскрава праяўлялася асоба арыстакрата і філосафа, паслушніка рамяства і апантанага імправізатара. Л. Анцімонаў даволі грунтоўна ведаў гісторыю развіцця сусветнага мастацтва і вельмі ўважліва “прыслухоўваўся” да сучасных мастацкіх працэсаў. Менавіта гэтыя рысы робяць яго творчасць актуальнай і прыцягальнай.

“Жывапіс я заўжды любіў і шмат займаўся ім у жыцці, – падкрэсліваў творца. – Пачынаючы з жывапіснага аддзялення Рыжскага вучылішча прыкладного мастацтва, дзе я ў свой час вучыўся...”[18]. Не аднойчы ў сваім жыцці мастак вяртаўся да жывапісу, які ў Анцімонава заўжды вылучаўся апавядальнасцю і лірычнасцю.

Нягледзячы на шчырую ўлюбёнасць Леаніда Анцімонава ў жывапіс, яго творчасць і педагагічная дзейнасць найбольш звязаны з графікай. “Выдатна валодаючы шматлікімі тэхнікамі графічнага мастацтва, да некаторых з іх Л.С. Анцімонаў як мастак выяўляў адмысловую цікавасць. Нямала высокамастацкіх творчых работ выканана майстрам у тэхніцы афорта” [5].

На працягу шэрагу гадоў наш зямляк з вялікім захапленнем працаваў над малымі графічнымі формамі, прымаў актыўны ўдзел у выставах і конкурсах. Ужо ў сярэдзіне 1970-х, калі прарвацца на арэну сусветнага мастацтва правінцыйнаму мастаку было проста немагчыма, Леанід Анцімонаў са сваімі экслібрысамі ўдзельнічаў

[17] З прамовы А. Мемуса на адкрыцці выставы Л. Анцімонава ў красавіку 2019 года. Запіс Ф. Грынеўскага.

[18] З інтэрв’ю з Л. Анцімонавым. Запіс – снежань 2009 г.

у шматлікіх міжнародных выставах [6]. І, трэба адзначыць, вельмі паспяхова. Некаторыя з экслібрысаў Л. Анцімонава трапілі ў каталогі буйных міжнародных экспазіцый кніжнага знака.

Відавочна, асобнага маштабнага даследавання заслугоўвае спадчына мастака ў тэхніцы манатыпіі і фларатыпіі (тэрмін Л.С. Анцімонава) [5]. “Манатыпія для мяне стала сапраўдннай знаходкай і адкрыццём, – падкрэсліваў Анцімонаў... – Далёка не ўсе ўспрымалі манатыпію як самастойнае мастацтва. Так, вельмі паважаная мной Аляксандра Паслядовіч лічыла манатыпію ўсяго толькі прыёмам, а не самастойным накірункам у мастацтве”[19].

На працягу ці не ўсёй творчасці мастака манатыпія была асноўным полем для рэалізацыі яго эксперыментальных ідэй. Праца Леаніда Анцімонава над манатыпіямі знешне сапраўды нагадвала своеасаблівы магічны рытуал алхіміка... “Сур’ёзнасць мяжуе з гульнёй, у якой мастак выкарыстоўвае разнастайныя інструменты і матэрыялы, кіруецца толькі яму вядомымі прынцыпамі арганізацыі кампазіцыі, «прыслухоўваецца да гучання» фарбаў, шукае ў каларыстычным хаосе патрэбны яму сэнс і мастацкі вобраз” [7]. Манатыпія давала творцу магчымасць атрымаць цікавыя каларыстычныя эфекты, фактуры, якія немагчыма паўтарыць іншым спосабам. “Па яго працах было бачна: за знешнім спакоем унутры Анцімонава віравалі моцныя эмоцыі...”[20].

У пошуках найбольшай мастацкай выразнасці сваіх манатыпій Леанід Сяргеевіч звычайна выконваў дзясяткі варыянтаў адной і той жа кампазіцыі, эксперыментаваў з разнастайнымі сумесямі фарбаў і разбаўляльнікаў, выкарыстоўваў розныя прылады, вялікую колькасць фактур, шматлікія тэхнічныя прыёмы друку. “Нярэдка працэс творчасці мяне захапляе больш чым вынік... Але я заўжды імкнуўся давесці працу да завяршэння. Увогуле зробленасць твора для мяне вельмі важны фактар” [1]. Невыпадкова многія мастакі адзначалі, што “творы Анцімонава – гэта вышэйшы клас майстэрства”[21].

Менавіта мэтанакіраваная праца над манатыпіяй дала ўнікальны матэрыял і паслужыла асновай для напісання цэлага шэрагу вучэбна-метадычных дапаможнікаў. Аднак галоўнай, вызначальнай мэтай было “стварэнне значных станковых, часам загадкавых асацыятыўна-эмацыянальных, з гульнёй колеру і формы, часта з філасофскім падтэкстам, мастацкіх твораў” [2].

Творы Л. Анцімонава надзвычай розныя: ад вобразна немудрагелістых кампазіцый, пабудаваных па першынстве ўдала аформленай каляровай плямы, да па-філасофску неадназначных полістылістычных метаапавяданняў. З аднолькавай патрабавальнасцю мастак працаваў над нефігуратыўнымі, фармальнымі кампазіцыямі і звыклымі рэалістычнымі краявідамі [7].

У сваіх творах Леанід Анцімонаў звяртаецца то да адлюстравання знешне бачнай рэальнасці, то да суб’ектыўных уласных ідэй ці асацыяцый, то паглыбляецца ў інтрасуб’ектыўныя творчыя пошукі. Але рафініраваны арыстакратызм творчай асобы мастака не прымае прывабнай, але халоднай прыгажосці, як і дакладнага падабенства з рэальнасцю, пазбаўленага ўласных ідэй. Вобразы яго кампазіцый – гэта заўжды шматслаёвыя сінтэзаваныя структуры, уключаныя ў сюжэтны кантэкст твораў, з’арыентаваныя на адлюстраванне суровай праўды жыцця, праблем, што хвалююць сучаснікаў [3].

Леанід Анцімонаў – мастак пераважна апавядальны, з відавочнай прыхільнасцю да стварэння цыклаў, у якіх эмацыянальна выразныя лірычныя матывы змяняюцца метафарычнымі ці напружана драматычнымі. Блакітныя мары аб палёце, чароўны свет музычных асацыяцый для мастака такія ж важныя, як і вечныя праблемы светаўладкавання, адлюстраванне жорсткасці навакольнага свету, бездапаможнасці чалавека перад стыхіямі і катастрофамі. Меладызм, як і поліфанічная шматгалоснасць, даволі часта становяцца вобразна-рытмічнымі дамінантамі яго твораў.

“Свет мастацкіх інтарэсаў, прыхільнасцей майстра шырокі – тут і Космас, які разумеецца шырока, усёахопна, як узаемапранікненне ўсяленскага і зямнога, і народныя паэтычныя паданні і ўяўленні, і гарманічны свет дрэў, траў і кветак, і лірычныя, тонка-адухоўленыя жаночыя вобразы... Але свет, ва ўяўленні мастака, не толькі гармонія, але і супрацьборства, і канфлікт, і драма” [8].

**Аб’яднанне «ОСА».** Многім добра памятныя цікавыя выставы трох сяброў-мастакоў – Леаніда Анцімонава, Аляксандра Салаўёва і Алега Арлова. Першая сумесная выстава гэтых “трох віцебскіх багатыроў” (як назваў іх Ф. Гумен[22]) з поспехам прайшла ў Полацку ў 1986 годзе, калі карцінная галерэя яшчэ размяшчалася ў Богаяўленскім саборы. Прыемна, што ў мінулым годзе праект з удзелам гэтых мастакоў вырашылі паўтарыць, каб узгадаць гэтых людзей і падкрэсліць значнасць усяго, што яны зрабілі. Усе тры творцы ўжо пайшлі з жыцця, але іх ідэі жывыя ў сэрцах

[19] З інтэрв’ю з Л. Анцімонавым. Запіс – снежань 1999 г.
[20] З прамовы В. Шылко на адкрыцці выставы Л. Анцімонава ў красавіку 2019 года. Запіс Ф. Грынеўскага.
[21] З прамовы В. Ральцэвіча на адкрыцці выставы Л. Анцімонава ў красавіку 2019 года. Запіс Ф. Грынеўскага.
[22] З прамовы Ф. Гумена на адкрыцці выставы Л. Анцімонава ў красавіку 2019 года. Запіс Ф. Грынеўскага.

маладога пакалення, а іх творчасць застаецца ўзорам сумленнага, шчырага стаўлення да мастацтва.

Пра аб'яднанне "ОСА" вядома не шмат. Ці не ўпершыню гэта абрэвіятура, складзеная з першых літар прозвішчаў мастакоў (Арлова, Салаўёва і Анцімонава), прагучала ў другой палове васьмідзясятых гадоў, калі ў Беларусі і на Віцебшчыне пачалі нараджацца незалежныя творчыя аб'яднанні з рознымі праграмамі і задачамі. Салаўёў, які быў яўным лідарам у гэтай творчай тройцы, быў праціўнікам усялякіх аб'яднанняў. Ён вельмі цаніў незалежнасць і творчую свабоду. Анцімонаў і Арлоў былі аднадушны ў гэтым з Салаўёвым. І разам з тым любоў да мастацтва і разуменне яго глабальных задач аб'ядноўвала ўсіх траіх, што і стала падставай для размоў пра ўтварэнне нефармальнай творчай групы "ОСА". "Мы арганізоўвалі групавыя і персанальныя выставы і стараліся дапамагчы, як маглі, адзін аднаму. І ў той жа час былі ўпэўненыя, што мастак – з'ява асабліва індывідуальная, і што яго творчы патэнцыял залежыць толькі ад асобасных якасцей і таленту. Мы стараліся наведваць буйныя выставы і музеі, галерэі Масквы, Ленінграда, Вільнюса, Рыгі. І, па магчымасці, выязджалі туды ўтрох. Пры гэтым кожны з нас меў сваю ўласную творчую праграму"[23].

Анцімонаў не аднойчы адзначаў, што Салаўёў, яго творчасць аказалі на яго моцны ўплыў. "Я вучыўся ў яго, спасцігаў каларыстычны лад карціны, усведамляў псіхалагічную ролю колеру. У яго за плячамі цудоўная школа. Да таго ж у Салаўёва ад прыроды выдатнае пачуццё колеру. На мяне заўжды ўплываў і сам працэс яго працы, і выніковы твор. Хоць мне здавалася, для Салаўёва часта галоўным быў сам працэс… Мы часта сустракаліся ў майстэрні Салаўёва ў яго дома і заўжды шчыра выказвалі адзін аднаму ўражанні ад новых твораў…[24].

"Усё творчае жыццё мы былі сябрамі, – казаў А. Салаўёў. – Былі ў нас і перамогі, і паразы. Я ўдзячны лёсу, што мы сышліся ў поглядах. І пры гэтым мы не падобныя адзін на аднаго. У нас з Анцімонавым было многа агульных інтарэсаў. Мы абодва вялікія кнігалюбы. Любоў да кніг нас аб'ядноўвала. А, як вядома, без кніг мастака няма. Узровень інтэлекту дыктуе тое, што мастак стварае. Галоўнае захаваць гонар і годнасць мастака. Быць чэсным і шчырым у сваёй творчасці. Вось за гэта я ўдзячны Анцімонаву"[25].

"Мы разумеем адзін аднаго, – адзначаў Л. Анцімонаў і дадаваў, – хоць і сварымся. Часам вельмі моцна... Але сяброўства не спыняецца"[26].

**Заключэнне.** "З пункту гледжання выніку я не змагу зрабіць столькі, колькі Рубенс... Напэўна, не паспею", – з доляй іроніі падсумоўваў адзін з нашых дыялогаў Л. Анцімонаў[27]. Аднак нават той след, які пакінуў гэты мастак і педагог, яскрава сведчыць аб неардынарнасці гэтай творчай асобы і яго сістэмы работы са сваімі студэнтамі. Безумоўна, творчыя поспехі гэтага мастака абумоўлены не толькі "натхненнем", але і яго велізарнай працавітасцю. "Я рады за свайго сябра, – адзначаў А. Салаўёў на выставе Л. Анцімонава праз год пасля яго смерці. – Ён стварыў свой свет у мастацтве, не крычаў, рабіў сваю справу ціха і шчыра"[28]. "Дай Божа, каб такіх людзей у Віцебску было болей, бо яны складаюць гонар гэтага горада. Яго інтэлект, яго культуру, яго багацце! Гэта трэба цаніць!"[29].

**ЛІТАРАТУРА**


1. Анцімонаў, Л.С. Вучыць творчасці / Л.С. Анцімонаў; гутарыў М.Л. Цыбульскі // Настаўніцкая газета. – 2000. – 12 жн. – С. 3.
2. Шамшур, В.В. История худграфа. Педагог и художник Леонид Антимонов / В.В. Шамшур // Современные проблемы развития художественного образования и визуальных искусств (к 100-летию Витебского народного художественного училища): материалы междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 20–21 дек. 2018 г. – Витебск, 2018. – С. 39–43.
3. Леанід Анцімонаў. Магія пошукаў і эксперыментаў: каталог выставы / Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна, Аддзел літаратуры па мастацтве; склад.: В.А. Дарафеева, М.Л. Цыбульскі. – Віцебск, 2010. – 40 с.
4. Костогрыз, О.Д. Эстампная мастерская ХГФ ВГУ имени П.М. Машерова. Коллекция графики и выставочная деятельность / О.Д. Костогрыз // Искусство и культура. – 2019. – № 3. – С. 93–100.
5. Костогрыз, О.Д. Гравюра на картоне в педагогической практике Л.С. Антимонова / О.Д. Костогрыз // Наука – образованию, производству, экономике: материалы XXI (68) Регион. науч.-практ. конф. преподавателей, научных сотрудников и аспирантов, Витебск, 11–12 февр. 2016 г.: в 2 т. / Витеб. гос. ун-т; редкол.: И.М. Прищепа (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2016. – Т. 1. – С. 190–192.
6. Анцімонаў, Л.С. "Душа мастака праз камп'ютар не выкажацца..." / Л.С. Анцімонаў; гутарыў М. Цыбульскі // Вечерний Витебск. – 1999. – 24 дек. – С. 1, 3.
7. Цыбульскі, М. Паміж магіяй і алхіміяй – праца / М. Цыбульскі // Мастацтва. – 2000. – № 3. – С. 37–40.
8. Леонид Сергеевич Антимонов. Монотипия, гравюра, рисунок, живопись: каталог / ред. и авт. вступ. ст. С.Н. Лазаренко. – Полоцк; Витебск: б. и., 1991. – [24 с.].


*Паступіў у рэдакцыю 27.01.2025*

[23] З інтэрв'ю з Л. Анцімонавым. 2008 г.
[24] З інтэрв'ю з Л. Анцімонавым. Запіс – снежань 2009 г.
[25] З выступлення А. Салаўёва на творчай вечарыне 18 студзеня 2010 г. Архіў Ф. Грынеўскага.
[26] З выступлення Л. Анцімонава на ўласнай творчай вечарыне 18 студзеня 2010 г. Архіў Ф. Грынеўскага.
[27] З інтэрв'ю з Л. Анцімонавым. Запіс – снежань 2009 г.
[28] З прамовы Салаўёва ў красавіку 2019 года. Запіс Ф. Грынеўскага.
[29] З выступлення А. Жукавай на творчай вечарыне 18 студзеня 2010 г. Архіў Ф. Грынеўскага.